# РЭЦЭНЗІІ

**MARINATOS N. Sir Arthur Evans and Minoan Crete: Creating the Vision of Knossos.** London ; New York : I. B. Tauris, 2015. 224 p.

У 2015 г. лонданскае выдавецтва «I. B. Tauris» прадставіла кнігу амерыканскага культуролага Нанны Марынатас, дачкі вядомага грэчаскага археолага Спірыдона Марынатаса (1901—1974), які адкрыў мінойскі горад на востраве Сантарын. Кніга «Сэр Артур Эванс і мінойскі Крыт» прысвечана брытанскаму даследчыку Артуру Эвансу (1851—1941), першаадкрывальніку мінойскай культуры на востраве Крыт, але не столькі апавядае пра дзейнасць А. Эванса як археолага, колькі выкрывае працэс стварэння ім пэўнага погляду на мінойскую цывілізацыю.

Нягледзячы на тое што старажытная гісторыя і археалогія карыстаюцца стабільнай цікавасцю ў вучоных розных напрамкаў і шырокай чытацкай аўдыторыі, у свеце выдана не так ужо і шмат абагульняючых прац пра першую вядомую цывілізацыю на тэрыторыі Еўропы. Усе гэтыя працы ў значнай ступені абапіраюцца на канцэпцыі, сфармуляваныя яшчэ А. Эвансам. Сітуацыя выглядае дзіўна, паколькі з часоў яго смерці мінула болей за палову стагоддзя і з таго часу было зроблена дастаткова адкрыццяў, каб істотна перагледзець даўно вядомую карціну. У спецыялізаваных выданнях перыядычна адбываюцца вострыя дыскусіі, але яны рэдка пакідаюць вузкія прафесійныя колы. Што ж з’яўляецца прычынай гэтага? Відавочна, сама асоба А. Эванса, а дакладней звязаныя з ёю двухсэнсоўныя абставіны, якія закранаюць увесь навуковы свет.

А. Эванс пачаў раскопкі на Крыце ў 1900 г. Н. Марынатас заўважае, што тагачасная археалогія ў Грэцыі канцэнтравалася вакол мясцін, звязаных са старажытнагрэчаскай міфалогіяй. Найбольш вядомым і паспяховым даследчыкам таго часу лічыўся Генрых Шліман (1822—1890). Яму належалі адкрыцці месца, якое ён ідэнтыфікаваў як старажытную Трою, а таксама Мікенаў і Тырынфа на Пелапанесе. Хоць асобу Г. Шлімана суправаджалі скандалы і абвінавачванні ў скажэннях і матэрыяль-

ных злоўжываннях, А. Эванс быў прыхільнікам яго ідэі існавання мікенскай культуры, якая папярэднічала дарыйскай. Г. Шліман першым звярнуў увагу на рэшткі старажытных канструкцый у Кносе. Многія біёграфы адзначаюць і ўскосны ўплыў Г. Шлімана на А. Эванса, паколькі той імкнуўся перасягнуць зробленае першаадкрывальнікам Мікенаў. Ужо праз некалькі дзён пасля пачатку раскопак брытанскі археолаг паведаміў на радзіму пра свае поспехі, таму што адчуваў канкурэнцыю з боку італьянскіх калег, якія пачалі раскопкі ў не меней перспектыўным Фесце.

Г. Шліман абагаціўся дзякуючы знаходкам старажытнасцей. А. Эванс выдаткоўваў на даследаванні частку асабістых грошай. Г. Шліман быў аматарам-скарбашукальнікам, а А. Эванс — прафесіяналам, які сур'ёзна ставіўся да тэорыі. У брытанскай навуцы XIX ст., калі адбывалася фарміраванне А. Эванса як вучонага, панавалі пазітывізм і эвалюцыянізм з іх імкненнем да стварэння ўпарадкаванай тэорыі на аснове агульнай для ўсіх навук метадалогіі. Эвалюцыяністы верылі ў адзіны для ўсяго чалавецтва шлях развіцця ў выглядзе лінейнага прагрэсу. Адпаведна яны разглядалі свае трактоўкі прыватных фактаў і падзей не як адзінкавых феноменаў, а як часткі цэлага.

Н. Марынатас звяртае ўвагу на тое, што погляды А. Эванса выспявалі паступова і ён быў дастаткова крытычным, каб прызнаваць, што лінейнае развіццё можа перарывацца заняпадам і рэгрэсам. У маладосці ён засвоіў ідэю шатландскага тэолага Вільяма Робертсана Сміта (1846—1894) пра тое, што сапраўдны даследчык павінен умець узнаўляць згубленую рэчаіснасць з кавалкаў. Пазней значнае ўздзеянне на яго аказалі працы брытанскага антраполага-эвалюцыяніста Эдварда Тэйлара (1832—1917). На прыкладзе створанай А. Эвансам постаці багіні-маці, якую быццам бы шанавалі старажытныя мінойцы, Н. Марынатас дэманструе залежнасць разумовых канструкцый археолага ад тлумачэння культу Кібелы Джэймасам Фрэйзерам (1854—1941). Значная частка ўяўленняў А. Эванса пра тое, чым павінна быць старажытная цывілізацыя, склалася да пачатку даследаванняў на Крыце.

Першы важны этап раскопак доўжыўся на працягу 1900—1905 гг. Прыступаючы да яго, брытанскі археолаг добра ведаў, што шукаў культуру больш старажытную, чым мікенская. У выніку ім былі практычна знішчаны верхнія культурныя пласты. Хоць пазней ён прызнаваўся, што не чакаў знайсці шмат каштоўнага, яго рызыкоўная стратэгія дала плён. Адкрыццё найстаражытнейшай еўрапейскай цывілізацыі зрабіла А. Эванса сусветна вядомым вучоным. Ён сцвярджаў, што знайшоў па-

лац міфічнага валадара Мінаса, і сам назваў адкрытую культуру мінойскай. Падчас раскопак яго папярэднія погляды значна змяніліся, аднак працягвалі ўплываць на вызначэнне ім знойдзеных артэфактаў.

У 1921—1936 гг. А. Эванс выклаў сваё бачанне адкрытай ім цывілізацыі ў шматтомнай працы «Палац Мінаса», якая, на думку Н. Марынатас, на доўгія гады абумовіла пошукі іншых археолагаў. Згодна з меркаваннямі брытанца, адкрыты ім палац з'яўляўся лабірынтападобнай канструкцыяй — правобразам знакамітага Лабірынта ў старажытнагрэчаскай міфалогіі і галоўным грамадскім цэнтрам Крыцкай дзяржавы ў першай палове II тысячагоддзя да н. э. Мінойскае грамадства яму падавалася адзіным і мірным. Рэлігійныя вераванні мінойцаў засноўваліся на шанаванні вялікай багіні, падобнай на малаазіяцкую Кібелу, а вядучая сацыяльная роля належала жанчынам са жрэчаскага саслоўя. Цікава, што ў працы прыводзіліся матэрыялы раскопак, якія супярэчылі карціне, намаляванай аўтарам. Так, у першым томе змяшчаліся апісанні мужчынскіх скульптур з месцаў шанавання [1, с. 682].

У адным з раздзелаў Н. Марынатас спыняецца на эвалюцыі поглядаў свайго бацькі. Ён спярша быў прыхільнікам ідэй А. Эванса, але, набыўшы асабісты вопыт даследчыка, паступова адмаўляўся ад іх. Канчаткова С. Марынатас упэўніўся ў іх хібнасці пасля адкрыцця мінойскага горада на Сантарыне. Хоць грэчаскаму археолагу прыходзілася фактычна абвяргаць свайго вялікага папярэдніка, ён ніколі прылюдна не ставіў пад сумненне высновы А. Эванса, імкнуўся прытрымлівацца распрацаванай у «Палацы Мінаса» храналогіі і нават спасылаўся на аўтарытэт А. Эванса, калі даваў тлумачэнні знойдзеным ім рэчам. Дык што спыняла С. Марынатаса? Ці толькі глыбокая павага перад чалавекам, які адыграў значную ролю ў яго асабістым лёсе і ў даследаванні грэчаскага мінулага? Н. Марынатас не дае прамога адказу на гэта пытанне, але зазначае, што паводзіны яе бацькі — толькі адзін з прыкладаў, характэрных для спецыялістаў, што вывучаюць мінойскую цывілізацыю.

Даследчыцкая рэчаіснасць па сваёй прыродзе даволі складаная, і тое, што тэарэтычныя погляды часам аказваюцца больш важнымі для канчатковых высноў, чым практычны досвед, не навіна для навуковага свету. Працэс даследчай працы ўключае пастаноўку мэты, якая фарміруецца на базе першасных уяўленняў даследчыка. Гэтыя ўяўленні, у сваю чаргу, уплываюць на канчатковы вынік даследавання. У некаторых выпадках вынік можа прымаць форму канструкцыі, далёкай ад таго, што ёсць на самай справе. Аднак у працэсе навуковай дзейнасці адбываецца

назапашванне новых фактаў, высновы пераглядаюцца і эфект першасных уяўленняў змяншаецца. Так адбываецца ў любой навуцы, у тым ліку ў археалогіі. Напрыклад, першыя даследчыкі цэнтральнаамерыканскіх культур прынялі грамадства старажытных майя за рэлігійных пацыфістаў, якія шанавалі час [4, с. 8, 9]. Але ў другой палове XX ст. іх погляды былі цалкам перагледжаны, выкрыты ваенныя канфлікты, сацыяльныя хваляванні, нанава апісаны міфалогія і рэлігія.

Выпадак А. Эванса больш складаны. Ён не проста высунуў пэўныя погляды, а стварыў тую мінойскую культуру, якую жадаў бачыць. З 1903 г. ён актыўна экспанаваў свае знаходкі. Сярод іх былі рэчы з так званай «храмавай скарбніцы», у тым ліку жаночыя фігуркі, названыя «багінямі са змеямі». Як высветлілася пазней, усе яны з'яўляліся падробкамі. А. Эванс быў папярэджаны наконт некалькіх фігурак, але працягваў адстойваць іх сапраўднасць і сцвярджаў, што сучасныя яму мастакі не здольны вырабіць статуэткі падобнай якасці [3]. «Багіні са змеямі» з'яўляліся яскравай ілюстрацыяй яго веры ў тое, што мінойцы шанавалі матрыярхальны жаночы вобраз, і ён не збіраўся адмаўляцца ад іх выкарыстання. Н. Марынатас таксама прыводзіць факты сумнеўных маніпуляцый А. Эванса з нібы знойдзенымі рэчамі — так званымі «пярсцёнкамі Нестара і Мінаса».

З 1905 г. па ініцыятыве брытанскага археолага праводзілася рэстаўрацыя Кноскага палаца. Асноўны этап работ прыпаў на міжваенны перыяд пасля 1925 г., якраз тады, калі А. Эванс публікаваў сваю працу. На гэтым этапе быў надбудаваны трэці паверх са знакамітымі чырвонымі калонамі, якія ў нашы дні з'яўляюцца візітнай карткай Кноса. Акрамя таго, былі зроблены істотныя выпраўленні ў інтэр'еры. Для рэстаўрацыі археолаг прыцягнуў некалькі прафесійных мастакоў. Найбольш вядомымі з іх былі швейцарцы Эміль Жылеран-старэйшы (1850—1824) і Эміль Жылеран-малодшы (1885—1939). Яны займаліся аднаўленнем фрэсак і ўнутранага аздаблення. Кэці Гір, аўтар кнігі «Кнос і прарокі мадэрнізму», выдадзенай у 1909 г., прысвяціла вынікам дзейнасці А. Эванса і запрошаных ім мастакоў у Кносе асобны раздзел [2, с. 105—140]. Яна паведамляе, што знакамітая кноская фрэска з дэльфінамі была «ўзноўлена» па ўсяго некалькіх малых фрагментах. На іх быў бачны толькі блакітны колер, але не постаці. Фрэска «Прынц з лілеямі» не супадае з рэшткамі фрагментаў, паверх якіх намалявана. Роспісы сцен так званай «троннай залы» першапачаткова ўпрыгожвалі падлогу. А. Эванс лічыў, што вытокі мінойскай культуры трэба шукаць у Афрыцы. Каб пад-

крэсліць сувязь мінойцаў з Егіптам і Лівіяй, мастакі надавалі людзям на фрэсках некаторыя негроідныя рысы, а таксама намалявалі двух тыповых афрыканцаў.

А. Эванс здолеў стварыць міф, заснаваны на моцным тэарэтычным падмурку. Ён аказаўся прывабным як для навуковага свету, які чакаў пацверджання сваім канцэпцыям, так і для шырокай публікі, уражанай цудоўнай казкай пра старажытную цывілізацыю, што мела развітую мастацкую культуру, была аб'яднана жаночым вобразам і не ведала ўнутраных ваенных разладаў. Да нашых дзён Кнос, зменены А. Эвансам, з'яўляецца другім па наведвальнасці археалагічным аб'ектам Грэцыі. Новыя пакаленні археолагаў, выхаваныя на дадзеным міфе, доўгі час не адважваліся адкрыта абвяргаць яго, паколькі гэта ставіла пад сумненне іх асабістую ідэнтычнасць. Назапашваліся новыя факты. Былі выяўлены горад на Сантарыне, значна большы па сваіх памерах, чым Кнос, рэшткі мінойскіх ваенных умацаванняў, сведчанні чалавечых ахвярапрынашэнняў, шанавання Бога ў мужчынскім абліччы і нават сакральнага канібалізму.

Супярэчлівыя дзеянні А. Эванса можна разглядаць як выклік. Але ўрэшце ён не здолеў пераадолець тую рэчаіснасць, якой падпарадкаваны кожны даследчык. Яго погляд на мінойскую цывілізацыю аналізуецца і пераглядаецца, і кніга Н. Марынатас — найлепшы таму доказ.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. *Evans A.* The Palace of Minos: A Comparative Account of the Successive Stages of the Early Cretan Civilization as Illustrated by the Discoveries at Knossos. London : Macmillan, 1921.
2. *Gere C.* Knossos and the Prophets of Modernism. University of Chicago Press, 2009.
3. *Lapatin K.* Snake Goddesses, Fake Goddesses. How Forgers on Crete Met the Demand for Minoan Antiquities // Archaeology. Vol. 54, № 1. 2001. P. 33—36.
4. *Гуляев В.* Забытые города майя. Проблемы искусства и архитектуры. М. : Искусство, 1984.

**Д. С. Самахвалаў,** дацэнт кафедры крыніцазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт